№3 сьнежань 2007

www.saligorsk.org

Свабодны Салігорск

незалежная газета

выдаецца пры падтрымкі “Маладога Фронта”

У Салігорску ў хуткім часе пабудуюць лядовы палац

Праект знаходзіцца ў стадыі распацоўкі, будоўля распачнецца на пачатку 2007 года.Фінансаваць будоўлю будуць зь мясцовага і абласнога бюджэту, “Беларуськалій” таксама выдзеліць значную частку грошаў.

Новы мэр акрэсьліў пэрспектывы развіцьця гораду ў наступныя некалькі год. Аляксандр Рымашэўскі, які тыдзень таму заняў пасаду старшыні райвыканкаму, зазначыў, што пабудаваць у горадзе лядовы палац ёсьць першаснай мэтай: “У нас спартыўны прэзыдэнт, і людзі мусяць весьці здаровы лад жыцьця”. У старшыні райвыканкаму не ўзнікае пытаньняў наконт мэтазгоднасьці будаваць адзін з самых дарагіх аб’ектаў за ўсю гісторыю сталіцы шахцёраў.

Натуральна, салігорцs ня будуць прымаць удзел у абмеркаваньні пытаньня “ці варта будаваць?”. Рашэньні такога кшталту прымаюць менскія чыноўнікі.Лядовыя палацы за 12 год кіраваньня Лукашэнкі, сапраўды сталіся сымбалем эпохі, фэноменам найноўшай гісторыі. Спартыўны прэзыдэнт гуляе ў хакей і адпаведная рэакцыя мясцовых вертыкальшчыкаў штогод зьяўляюцца палацы для гульняў ў “прэзідэнскі спорт”.

Будаўніцтва чарговага палацу яшчэ раз яскрава дэманструе, што ў нашае краіне эканоміка працуе ня згодна прынцыпаў і законаў, а згодна загадаў і жаданьня кіраўнікоў.

Лядовы палац наўрацьці акупіцца ў стотысячным Салігорску, няхай і адным з самых багатых гарадоў. Размяшчэньне палацу ў гэтым рэгіёне будзе памылковым рашэньнем з эканамічнага пункту гледжаньня: стотысяны Салігорск, дзесятак абяднелых вёсак, Слуцак і Старобін, чые жыхары ня могуць дазволіць сабе з мінімальнымі заробкамі стала карыстацца паслугамі спартовага комплексу.

Ня варта разглядаць будаўніцтва спартовага комплексу як адзіны выпадак. Гэта ёсьць паказчык хваробы ўладаў, якія нават на фоне набліжаючагася пераходу да рынкавых коштаў на расейскі газ і нафту, не спыняюць распрацоўку праекта. Да любой справы трэба падыходзіць з розумам і адказнасьцю.

Працяг на старонке 2

СЛУЦКІ ЗБРОЙНЫ ЧЫН. 86-Я УГОДКІ

26 лістапада ў Слуцаку адбыўся мэмарыяльны мітынг з нагоды 86-х угодкаў Слуцкага збройнага чыну.

У гэтым годзе мітынг быў больш масавы з-за ўдзелу ў ім вялікай колькасьці маладзёнаў. У мерапрыемстве, зарганізаваным КХП БНФ, прынялі ўдзел прад-стаўнікі з розных рэгіёнаў Беларусі. Мерапрыемства было падтрымана Маладым Фронтам, актывісты якога адмыслова прыехалі зь Менску, Салігорску, Магілёву, Воршы і іншых гарадох.

Выступоўцы ўспаміналі герояў Слукага збройнага чыну, а таксама закранулі грамадзка-палітычныя й сацыяльныя праблемы нашае краіны.

Угодкі скончыліся традыцыйным сьпевам гімну Беларусі "Магутны Божа" і ўскладаньнем кветак да цяперашняга гістарычнага музэю, у будынку якога ў 1920 годзе была абвешчаная Слуцкая Рада, што прызнала ўладу Беларускае Народнае Рэспублікі.

Мітынг адбыўся без затрыманьняў. Пэўныя праблемы з міліцыянтамі ўзьніклі ў салігорскіх маладафрантоўцаў, аўтобус якіх супрацоўнікі ДАІ, невядома зь якой на-годы, перасьледавалі да самога Салігорску.

У Салігорску ў хуткім часе пабудуюць лядовы палац

У адсутнасьці гэтых якасьцяў у цяперашніх чыноўнікаў салігорцы не сумняваюцца.
Вядома, дзяржава мусіць падтрымліваць і развіваць спорт. А калі ў школах Любіньшчыны, Случчыны і Салігорску не хапае спартыўнага інвэнтару, сэнс будаваць палац. Тыя вялізарныя сродкі рацыянальна было б размеркаваць па школам Менскае вобласьці, што магло б значна палепшыць умовы для правядзеньня заняткаў фізічнае культуры. Спатрэбіліся б гэтыя грошы і ў спартовых секцыях рэгіёну, дзе за значнага недахопу фінансаў бракуе кваліфікаваных спецыялістаў, інвэнтару, транспарту, што адыгравае значную ролю у развіцьці спорта і выхаваньню маладога пакаленьня алімпійцаў.

Аднак мясцовыя ўлады зацьвердзілі плян і на пачатку наступнага года распачнецца будоўля. Зьявіцца і нагода для выпуску беларускіх навінаў, дзе з захапленьнем будуць распавядаць пра посьпехі і дасягненьні эканомікі, пра узнагароды спартоўцаў, пра чарговую перамогу прэзыдэнскай хакейнай каманды, а сотні дзетак у вёсках дагэтуль ня ведаюць, што такое інтэрнэт і кампутар, замест спартовых заняткаў зьбіраюць на калгасных палях бульбу.
Дарэчы, некалькі год таму, два школьнікі зь вёскі Асавец (Любаньскі раён) напісалі ліст Лукашэнку і прасілі забясьпечыць іх школку футбольнымі і баскэтбольнымі мячамі.
Аднак замест дапамогі да бацькоў навучэнцаў прыехалі мясцовыя начальнікі КДБ і правялі размову. У выніку мячы так і не зьявіліся, толькі сапсаваліся нэрвы.

У Салігорску асьвечаны новы каталіцкі касьцёл

Ва ўрачыстай цырымоніі асьвячэньня касьцёлу пад назваю сьвятога Францішка Асызкага і ў службе, якую правёў апостальскі адміністратар Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі, біскуп Антоні Дзям'янка, брала ўдзел некалькі сотняў чалавек. Будаўніцтва гэтай сьвятыні ў Салігорску працягвалася з 1997 году.
Ва ўрачыстым пасьвячэньні новага салігорскага касьцёла ўдзельнічала каля паўтысячы вернікаў,сьвятары з розных месцаў Беларусі, а таксама з Аўстрыі, Польшчы і Расеі. Адпраўляў урачыстую службу біскуп Антоні Дзям'янка. Касьцёл, які пабудаваны ў самым цэнтры Салігорску ня мог зьмясьціць усіх вернікаў. Пра тое, як праходзіла ўрачыстасьць апавядае салігорскі каталіцкі актывіст Уладзімер Гарэлікаў:
(Гарэлікаў:) " Улічваючы, што гораду толькі 50 гадоў, тут увогуле не было каталіцкай сьвятыні. І гэта сапраўдная сьвятыня для каталіцкіх вернікаў. Сёньня былі падзякі будаў-нікам, тым уладам, якія аддалі для касьцёлу месца ў цэнтры гораду. Маліліся за Беларусь, за лепшы час для нашай краіны".Імша і пасьвячэньне касьцёлу адбываліся па-беларуску. Пра важнасьць гэтай падзеі для каталіцкай грамады Салігорску гаворыць вікарый касьцёлу сьвятога Францішка Асызкага, айцец Флярыян Казлоўскі:
(а.Казлоўскі:) " Калі маленькае дзіця прыносяць у касьцёл і хрысьцяць, таксама ёсьць і хрост храма. Калі біскуп намашчае сьцены касьцёла, алтар, дзе будзе адпраўляцца сьвятая Імша. Сам біскуп адкрывае гэты дом Божы, дзе адпраўляецца Імша і сьвятыя таінствы".
Пра новы касьцёл гаворыць яго архітэктар Іван Далматовіч:
(Даўматовіч:) " Гэта такі стыль, яго нельга назваць функцыяналізмам, мадэрнізмам. Гэта элемэнты алегорыі на тэму беларускай архітэктурнай школы . Сымбіёз касьцёла з кляштарнымі памяшканьнямі. Тры паверхі кляштарных пабудоваў і адзін паверх касьцёльная заля".У Салігорску пры новым касьцёле служаць манахі з ордэну Францішканаў. А першая каталіцкая Багаслужба ў Салігорску адбылася ў прыватнай кватэры ў 1992

Дык падпішыся!

Свабодны Салігорск — мясцовая газэта, якая выходзіць раз у месяц пры падтрымцы "Маладога Фронта". У газэце можна знайсьці агляд асноўных падзяў у Салігорску і рэгіёне , артыкулы пра грамадзка-палітычнае жыцьцё гораду, артыкулы ,кранаючыя найбольш актуальныя праблемы.
Зараз у кожнага салігорца існуе магчымасьць рэгулярна атрымліваць газэту. Для гэтага трэба проста замовіць наступны нумар у распаўсюднікаў. Тэлефоны : **+375293700204** і **+375291176230**. Карыстайцеся!

Любаньшчына вымірае

Дэмаграфічная сітуацыя ў Любаньскім раёне за апошнія гады набыла адмоўныя сталыя тэндэнцыі, як агулам па рэспубліцы.
Беларусь вымірае за апошнія 12 год колькасьць насельніцтва зьменшылася на 500 тыс. чалавек, больш за 700 тысячаў працуе ў Расеі, яшчэ больш па ўсім сьвеце.
Гэтыя працэсы закранаюць і Любаньшчыну.
Статыстыка ўвогуле жудасная: з студзеня па ліпень 2006 года зафіксавана 187 нараджэньняў і 403 сьмерці, колькасьць нараджэньняў падае ў сярэднім на 10-15 чалавек у год.
Прыкладна 300-350 штогод пакідае Любань, прычым колькасьць зьехаўшых значна перавышае колькасьць тых,хто прыбыў.
У асноўным пакідае горад моладзь. Шмат хто зь іх ня бача ніякіх перспектываў, таму і шукае працу ў вялікіх гарадох. Відавочна, праграмы прэзыдэнта ў рэчаіснасьці не эфектыўныя, а час ідзе і ўсё больш "мёртвых" вёсак, пустых хатак і ўсё больш могілак.....
Цікава той факт, што негледзячы на такую жудасную сітуацыю, чыноўнікі бачаць і станоўчыя факты. Па словах Аляксандра Ісайка , начальніку аддзела статыстыкі, колькасьць разводаў зьмяншаецца: у 2002 іх было 132, у 2005 ужо 78.
Вось такія адмоўныя і станоўчыя фактары. Любаньшчына сьпіваецца, вымірае і, нажаль, мясцовыя ўлады ня могуць супрацьстаяць гэтым працэсам будаваньнем "прэзыдэнскіх домікаў" і працаўладкаваньнем маладых спецыялістаў, якія трапляюць час ад часу з менскіх універсітэтаў па разьмеркаваньню.

Новы Стадыён

Пасьля капітальнага рамонту і рэканструкцыі 4 лістапада адбылося ўрачыстае адкрыцьцё салігорскага стадыёну "Будаўнік".
Як заўважылі спецыялісты, у тэхнічным пляне будоўля была даволі цяжкім аб'ектам,некаторыя канструкцыі балі неаднаразова паддаваны выпрабаваньням.
Негледзячы на дрэннае надвор'е, заплянаванны на 14:00 матч "Шахтар-БАТЭ" адбыўся і салігорская каманда перамагла ў цяжкай гульне 3:2.

16 - АДМЫСЛОВЫ ДЗЕНЬ ДЛЯ САЛІГОРСКАЕ МІЛІЦЫІ

16-га кожнага месяца для салігорскае міліцыі адмысловы дзень. Вось ужо на працягу году на цэнтральнай плошчы горада а восьмай гадзіне вечара 16-га кожнага месяца зьбіраецца моладзь са сьвечкамі і партрэтамі ў руках. З гэтае нагоды ў міліцэйскім пастарунку адбываецца спэцыяльная нарада з удзелам вялікай колькасьці супрацоўнікаў. Там яны вызначаюць як змагацца з "адмарозкамі" а восьмай гадзіне на плошчы, распрацоўваюць плян дзеяньняў.

Мінулым разам міліцыянтамі, пад кіраўніцтвам адмыслова прыбыўшага палкоўніка зь Менску, было вырашына разагнаць моладзь. Міліцыянты ўчынілі вэрхал пасярод гораду, затрымалі пяцёрых удзельнікаў, пагражалі суткамі, калі хто-небудзь наступным месяцам зьявіцца на плошчы. Аднак тады моладзь не стала чакаць месяц і зьдзейсніла акцыю ўвечары 17-га.

Гэтым разам міліцыянты ізноў грунтоўна падрыхтаваліся. Ужо за гадзіну да восьмай за "Домам Культуры" чакаў аўтазак і навенькі вялікі аўтобус "МАЗ", у раёне плошчы патрулявалі супрацоўнікі, даглядалі асабістыя рэчы ў мінакоў, шукалі сьвечы ды партрэты. Так бы мовіць: псыхалягічныя хітрыкі. Аднак у назначаны час на плошчы зьявіўся ланцуг неабыякавых людзей з 40 чалавек з партрэтамі палітзьняволеннага Зьмітра Дашкевіча і сьвячамі ў руках. Неўзабаве, як у фільмах пра тэрарыстаў, з гарвыканкаму і "МАЗа" пачалі выскокваць міліцыянты ў колькасьці раза ў паўтара большай за колькасьць удзельнікаў акцыі.

Абступілі гэтых удзельнікаў з усіх бакоў. Распачалі відэаздымку. Мінакоў і тых, хто не пасьпеў у час выйсьці на плошчу, туды ўжо не пушчалі. Затрымліваць, аднак, нікога ў адрозьнены ад мінулага разу не сталі.

Адна дзяўчына, удзельніца акцыі , пракамэнтавала гэта так: "Можа зразумелі, што затрыманьні толькі ім на шкоду. Мінулым разам разагналі людзей і чаго дабіліся: моладзь наступным жа вечарам выйшла ізноўку на плошчу з партрэтам ды зьдзейсьніла ў знак пратэсту яшчэ шэраг іншых акцый. Застаецца толькі не зразумелым, навошта сёньня было чыніць гэты маскарад, зганяць столькі міліцыянтаў. Людзі ж бачаць і ведаюць, што да чаго. А заўтра, я вам гарантую, увесь горад будзе распавядаць, як паўсотні супрацоўнікаў міліцыі прыйшлі рабіць відэаздымку адважных маладзёнаў, замест таго каб лавіць злачынцаў. І каго пасьля гэтага салігорцы будуць лічыць адмарозкамі?"

Прэс-служба Салігоскага МФ
Алесь Міхалок

Музычны Форум 2006 у Сеціве

9 лістапада з дапамогай САЛІГОРСК.org адкрыўся сайт салігорскага конкурсу вакалістаў "Музычны Форум".

Знайсьці яго можна па адрэсе **www.MUZFORUM.saligorsk.org.** На рэсурсе знаходзіцца інфармацыя пра ўдзельнікаў і пераможцаў, пляны аганізатараў, кароткія зьвесткі пра будучыя і мінулыя туры.

Гэта можаш і ТЫ!

"Музычны Форум 2006"-ёсьць першы крок у рэалізацыі доўгатэрміновай праграммы развіцьця беларускамоўнага інтэрнэту ў Салігорску і рэгіёне.

У рамках праграмы мы забясьпечваем бясплятным хостынгам і рэгіструем даменнае імя yoursite.saligorsk.org і калі гэта патрэбна, аказваем дапамогу ў распрацоўцы дызайну. Карыстайцеся!

З павагай, адміністрацыя праекту САЛІГОРСК.org

В Солигорске появится ещё одно солёное озеро

На территории между 1, 2 и 3-им Солигорскими рудоуправлениями идёт строительство нового шламохранилища, где будут складироваться жидкие отходы производства - рассолы.

Каждое рудоуправление имеет своё такое озеро. Но со временем они мелеют из-за выпадения твёрдых фракций, и возникает необходимость возводить новые. Строящееся шламохранилище займёт территорию в 83,7 гектара и вместит в себя 16,6 миллиона кубических метров жидких отходов.

"Первая очередь шламохранилища площадью в 14 га будет сдана в эксплуатацию в августе следующего года, - сказал корреспонденту "Кур'ера" Михаил Дубровский, начальник производственно-технического отдела СУ-149, которое ведёт строительство. - Нужно не только вынуть и переместить грунт, но и обустроить ложе и берега - положить специальную плёнку и засыпать её песком, чтобы рассолы не проникали в почву.

В Солигорске новый мэр из слуцкой вертикали

Назначение нового мэра Солигорщины стало самой обсуждаемой темой недели в кулуарах солигорской вертикали. Что он за человек, какой специалист и управленец? За комментарием мы обратились к Александру Драко, председателю Слуцкого райисполкома. “Отличный специалист, - отозвался слуцкий мэр о своём бывшем подчинённом. - Я, как руководитель района, сожалею о его уходе. Мне 58 лет, и я надеялся, что Александр Брониславович впоследствии возглавит администрацию Слуцкого района. Он человек дела и достоин продвижения по карьерной лестнице. Думаю, что первое время солигорчанам придётся нелегко. Он заставит всех работать. Сам в шесть утра поедет на ферму, и подчинённым придётся последовать его примеру”. Александр Римашевский корреспонденту “Кур’ера” рассказал: “Пока я вникаю, знакомлюсь с хозяйствами района. В первую очередь, думаю, приступим к выполнению программы возрождения села. Улучшим материальную базу колхозов за счёт получения товарной продукции, наращивания поголовья скота. Земли на Полесье не такие плодородные, как на Случчине. Я разговаривал с солигорскими сельчанами и выяснил, что зарплата в хозяйствах ниже, чем на Случчине, на 100 тысяч рублей. Значит, будем развивать сельское хозяйство, зарабатывать. С протянутой рукой не пойдём”. Александр Римашевский также упомянул о строительстве Ледового дворца.

Ожидается, что 30 % финансирования этого объекта будет производиться из средств облисполкома, 30 % - за счёт РУП “ПО “Беларуськалий”. Солигорский рынок “Старовокзальный” новый мэр охарактеризовал как “дикий” и сказал, что в перспективе торговля здесь будет организована по примеру слуцкого рынка, т.е. в павильонах. Что касается развития инфраструктуры города, Римашевский отметил: Солигорску требуется больше объектов общепита и торговли.

Отдельным пунктом политики нового мэра проходит строительство спортивных площадок: “У нас президент спортивный, и люди должны вести здоровый образ жизни”. Связи, приобретённые во время службы в аппарате управления Слуцкого райисполкома, главе солигорской вертикали пригодятся. Во всяком случае, со слуцкими мясокомбинатом и комбинатом хлебопродуктов Александр Римашевский планирует продолжить работу.

P.S. Николай Артюшкевич, предыдущий председатель Солигорского райисполкома, назначен председателем Дзержинского райисполкома. Михаил Омельянчук, возглавлявший Солигорский горисполком, в настоящее время находится в отпуске. Его будущее место работы редакции выяснить не удалось.

Справка “Кур’ера” Александр Римашевский родился в 1964 году в д.Трухановичи Копыльского района. Окончил Белорусский институт механизации сельского хозяйства. Работал заведующим машинным двором, главным инженером, председателем колхоза им.Суворова Копыльского района. С 2002 года - первый заместитель председателя Слуцкого райисполкома.

Татьяна Гусева

Салігорск: вянок з калючага дроту да помніка Леніну

Каля дзесяці дэмакратычных актывістаў Салігорску спрабавалі ўскласьці свой вянок да помніку Леніна. Вянок зроблены з калючага дроту, на якім на стужцы надпіс – “Ахвярам таталітарызму 1917 – 1991. 1994 –2006”.Пра дзеяньні міліцыі адносна дэмакратычных актывістаў распавядае ўдзельнік акцыі Іван Шыла:

(Іван Шыла:) “Адначасова з намі ішла працэсія з гарвыканкаму. Таму яны (міліцыянты) сказалі, што трэба станавіцца ў чаргу – мы другія мусім быць. Па-другое, яны выдумалі нейкі стандарт вянкоў. Маўляў, тое, што да вянка прымацаваны калючы дрот – не падыходзіць па стандартах. І навогул з такім вянком нельга рухацца па горадзе. Таму трэба нам пастаяць, але ані ў якім разе не ўскладаць”.Калі вянок паспрабавалі ўсё ж ускласьці, быў затрыманы малодшы брат Івана – Ільля Шыла:

(Ільля Шыла:) “У пастарунку аніякіх пратаколаў не складалі за само затрыманьне. Толькі склалі пратакол пра тое, што забралі ў мяне гэты вянок на праверку”. Тым часам, тыя, хто засталіся ля помніку Леніну, паклалі да п’едэсталу стужкі з надпісам “Ахвярам таталітарызму 1917 – 1991. 1994 –2006”. Працягвае **(Іван Шыла:)** “Усклалі гэтыя стужкі на кветкі, якія паклала вышэйзгаданая дэлегацыя. Выявілася, што гэта парушэньне заканадаўства, бо на чужыя кветкі свае стужкі класьці нельга. Таму нашыя стужкі проста парвалі”. Пятнаццацігадовы Іван Шыла прэзэнтуе непрызнаную ўладамі арганізацыю “Малады Фронт”. Сёлета Іван ачоліў дзевяцідзённую галадоўку салігорскіх актывістаў у супраць перасьледу “Маладога Фронту” і на падтрымку палітзьняволеных.

Севярын Квяткоўскі, Менск

Непрыемныя весткі зь Пекіну

На фоне яўнога тупіку ў газавых перамовах з «Газпрамам», неспрыяльныя весткі для Лукашэнкі дашлі і зь Пекіну, дзе амбасада РБ у КНР спрабуе выратаваць кантракт на пастаўку ў «паднябесную» у 2007 годзе калійных угнаеньняў. Кітайцы патрабуюць у надыходзячым годзе значнага паніжэньня кошту на пастаўляемыя ўгнаеньні. Праблема абцяжарваецца яшчэ тым, што дамова 2006 года не будзе рэалізавана больш, чым на 50 адсоткаў. Беларускі бок настойвае на павелічэнні аб'ёму ў 2007 годзе за кошт невыбрананага аб'ёму 2006 года.

WWW.SALIGORSK.ORG
САЛІГОРСК.org
[САЛІГОРСК.org]
Інфармацыйны сайт
пры падтрымцы Маладога Фронта
незалежны інфармацыйны партал пра падзеі ў Салігорску й рэгіёне;
грамадска-палітычны форум;
бясплатны хостынг для беларускамоўных сайтаў;
ЁСЬЦЬ НАВІНА - ПАВЕДАМІ НАМ!
Тэлефон: (029)370-02-04
(029)379-58-99
Эл. пошта:
saligorsk@saligorsk.org
salihorsk@gmail.com

Свабодны Салігорск http://gazeta.saligorsk.org
e-mail: saligorsk@saligorsk.org
8(029)3795899 8(029)3700204
Адказнасьць за інфармацыю зьмешчаную у артыкулах нясуць аўтары
Надрукавана на тыпаграфіі “Вораг Народа” г. Смаленск вул. Ф.Э. Дзяржынскага 17, 07.12.06 наклад 298